Зберагчы і працягнуць

# 12 ІМГНЕННЯЎ СПАДЧЫНЫ

**Адкрыццё выстаўкі рэдка пачынаецца са спеваў і казак. Але ў нашым выпадку гэта было не толькі апраўданым рэжысёрскім ходам, але і неабходнасцю, бо і спевы, і казкі — неад'емная частка экспазіцыі «Нематэрыяльная культурная спадчына Міншчыны», што працуе ў Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці. Упершыню тут сабралі і паказалі дванаццаць элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны з розных куткоў Мінскай вобласці, унесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў (а два з іх — калядны абрад «Цары» з вёскі Семежава на Капыльшчыне і «Будслаўскі фэст» з Мядзельскага раёна — уключаныя ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА).**

«Нематэрыяльная спадчына як культурная з'ява яшчэ не да канца ацэненая грамадствам, дый нават самімі носьбітамі, — мяркуе **вядучы метадыст аддзела традыцыйнай культуры МАЦНТ Ігар ЖАЛТКОЎ.** — Між тым менавіта яна з'яўляецца краевугольным каменем ідэнтычнасці беларусаў. Вобраз Беларусі ў свядомасці яе жыхароў складаецца, як пазл, з элементаў нематэрыяльнай спадчыны, і гэты вобраз злучае нас у адзіны народ. Таму цяперашняя выстаўка — вельмі значная, і, на мой погляд, у поўным сэнсе ўнікальная падзея, якая прадстаўляе шырокую палітру ідэнтыфікатараў нацыянальнай культуры».

«Зараз рыхтуюцца дакументы па ўнясенні ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў яшчэ двух аб'ектаў — гэта абрад выпякання хлеба ў вёсцы Жораўка Любанскага раёна і традыцыя саламяных дываноў «Рухаўскія дываны» Старадарожскага раёна», — дадае **кіраўнік Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Ірына ПАЗНЯК.**

«Само паняцце «нематэрыяльная культурная спадчына» з'явілася адносна нядаўна — у 2003 годзе, пасля прыняцця адпаведнай канвенцыі ЮНЕСКА, якую наша краіна падпісала адной з першых у свеце, — нагадвае **дырэктар фонду «Культурная спадчына і сучаснасць», эксперт Беларусі ў міжурадавым камітэце па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА Ала СТАШКЕВІЧ.** — З 2014 года мы актыўна пачалі працэс ідэнтыфікацыі, інвентарызацыі гэтай спадчыны — былі створаны беларускі нацыянальны інвентар «Жывая спадчына». І я вельмі рада, што за пяць гадоў, якія мінулі з пачатку гэтай работы, у спісе гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ўжо 126 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Асабліва ўсцешвае тое, што працэс ідзе знізу ўверх, ад саміх носьбітаў гэтых традыцый, рамёстваў, абрадаў і практык, якія зацікаўлены, каб дзяржава ўзяла пад ахову элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, забяспечыла іх жыццядзейнасць. Бо гэтыя рэчы нельга законсерваваць, яны — плыні ў вялікай рацэ жывой культуры, што мусіць развівацца і перадавацца з пакалення ў пакаленне».



Як элементы нематэрыяльнай спадчыны прадстаўленыя на выстаўцы? Вельмі нават рэчыўна і адчувальна. У адным кутку прасторнай залы стаіць стол, дзе ўсе ахвотныя могуць прысесці і пачытаць казкі Лідзіі Міхайлаўны Цыбульскай — альбо паглядзець на відэазапісах, як іх расказвала сама носьбітка. (Яна, на жаль, некалькі гадоў таму пайшла з жыцця, але казкі засталіся — і ў вусным пераказе пераемніц, і ў друкаваным зборніку «Казкі з прынёманскай хаткі», які ўбачыў свет дзякуючы збіральнікам і папулярызатарам традыцыйнай культуры). Гэтаксама можна адчуць праз відэасюжэты характво спеўных традыцый з розных раёнаў Міншчыны, памацаць макет дуба, на які цягнуць Каляду, падрабязна вывучыць фоталетапіс розных абрадаў.

У другім куце — персанажы архаічнага каляднага абраду «Шчадрэц»: Каза, Баба і Дзед у адмысловай берасцяной масцы, на кожнага з якіх не толькі варта падзівіцца, але можна і дакрануцца да іх, каб ярчэй уявіць іхнія скокі і спевы.



А па суседстве са шчадроўнікамі прыцягвае позірк галоўны герой абрадавага ігрышча «Ката пячы». Да яго не рэкамендуецца падыходзіць галодным, каб не захлынуцца слінкамі, бо кот са Скірмантава смачны: сабраны з булак, кілбас і сала. «Пра гэту жывую традыцыю расказала мне свякроў, — гаворыць **жыхарка аграгарадка Скірмантава Наталля РЭДЗЬКО.** — Ладзяць ігрышча 27 лістапада, да перадкалляднага посту, каб нагуляцца і нажартавацца, як кажуць, на ўвесь год. Хто гуляе? Жанатыя — каб усё ладзілася ў сям'і, нежанатыя, моладзь — каб знайсці сваю пару, а кот выступае ахоўнікам дзеючых і будучых сем'яў. Ката выпякаюць, збіраюць з каваклаў і падвешваюць высока пад столь, а ўдзельнікі ігрышча бяруць хто відэльцы, хто качаргу і падскокваюць, каб адкусіць кавалак ад ката — і ўсё гэта з танцамі, жартамі, прыгаворкамі...»



Пасярод залы — не заўважыць наўпрост немагчыма — кросны з чырвона-белым ручніком, які прадстаўніца Капыльшчыны, народны майстар Таццяна Волкава вырабляе па тых жа тэхналогіях і з тымі ж узорамі, якія некалі скарыстоўвалі нашы пра- і прапрабабулі. А побач прэзентуе свае работы **народны майстар з Валожыншчыны Хрысціна ЛЯМБОВІЧ**, чыя вучаніца тут жа на месцы дэманструе, што такое ткацтва паясоў «на ніце». Хрысціна, дарэчы, з тых руплівіцаў, хто не толькі зберагае рамёствы і традыцыі, але і перадае іх малодшым пакаленням: яна кіруе і гуртком ткацтва, і вучнёўскай батлейкай, выконваючы адначасова педагагічную, асветніцкую і сацыяльную работу. За многія гады ўжо некаторыя яе вучні маюць уласных вучняў. «Не ўсіх дзяцей можна зацікавіць традыцыйнай культурай, — пагаджаецца майстар, — каб зрабіць адзін толькі пояс, трэба шмат цярпення, бо баваўняныя і шарсцяныя ніткі могуць і блытацца, і рвацца, далёка не кожнае дзіця тут справіцца. Але ўжо тыя, хто прыходзіць і затрымліваецца, уцягваюцца ў справу напоўніцу. З майго вопыту, гэтыя дзеці, нават калі яны з неўладкаваных сем'яў, але вельмі адкрытыя, «несучасныя», гатовыя ўспрымаць матэрыі народнай культуры». Зрэшты, майстар-класамі па народных рамёствах усё часцей цікавяцца і дарослыя людзі, гараджане, якія жадаюць звярнуцца да каранёў. І якраз гэта ўсцешвае носьбітаў і захавальнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, бо калі традыцыі запатрабаваныя ў сучаснікаў — яны жывуць...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
**Больш фота глядзіце на www.zviazda.by.**

## Што, дзе, калі

**Калядны абрад «Цары» з вёскі Семежава Капыльскага раёна атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі ў 2008 годзе.**

**Мясцовы стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых песень аўтэнтычнымі фальклорнымі гуртамі «Журавушка», «Глыбокія крыніцы» і «Паваляккі» з вёсак Закальное, Ямінск, Вобчын Любанскага раёна ўнесены ў Дзяржаўны спіс у 2008 годзе.**

**Калядны абрад «Шчадрэц» з вёскі Рог Салігорскага раёна — статус нададзены ў 2009 годзе.**

**Калядны абрад «Цягнуць Каляду на дуба» з вёскі Новіны Бярэзінскага раёна атрымаў статус НКС у 2012 годзе.**

**Традыцыя ткацтва паясоў у Валожынскім раёне (аграгарадкі Сакаўшчына, Ракаў) — 2016 год.**

**Выканальніцкае майстэрства ў жанры казачнай прозы Л. М. Цыбульскай з вёскі Магільна Уздзенскага раёна — 2016 год.**

**Традыцыя шанавання Святога каменя ў вёсцы Крамянец Лагойскага раёна — 2016 год.**

**Урачыстасць у гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай «Будслаўскі фэст», Мядзельскі раён — 2016 год.**

**Абрад пераносу Міхайлаўскай свечкі ў аграгарадку Вяляцічы, Барысаўскі раён — 2016 год.**

**Спеўная традыцыя міжрэчча вярхоўяў Пцічы і Случы, вёскі Баранава і Прусы Старадарожскага раёна — 2016 год.**

**Тэхніка закладнога ткацтва чырвона-белых ручнікоў з вёскі Семежава Капыльскага раёна — 2012 год.**

**Ігрышча «Ката пячы» ў аграгарадку Скірмантава Дзяржынскага раёна — 2017 год.**

Месцы чароўнай сілы

# МОЦ ГАЮЧЫХ КРЫНІЦ

**Днямі ў Мінску адбылося ўрачыстае закрыццё сезона працы валанцёраў руху «Добрае Сэрца». З 2013 года ў рамках праекта Саюза моладзі «Аднаўленне святынь. Крыніцы Беларусі» яны добраўпарадкоўвалі тэрыторыі і дапамагалі аднаўляць цэрквы, саборы, касцёлы, іншыя культавыя аб'екты. На сённяшні дзень добраахвотнікі выканалі такія работы прыкладна на 780 аб'ектах па ўсёй краіне, у тым ліку 200 праваслаўных храмаў і манастыроў.**

— Праект звязаны з нашымі каранямі, бацькамі, прадзедамі. Ён кажа пра самае галоўнае — пра любоў да роднай зямлі. У гэтым годзе пачатак работы быў пакладзены ў красавіку ў вёсцы Пустынкі Мсціслаўскага раёна. Валанцёры добраўпарадкавалі тэрыторыю Свята-Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра і адной з трох яго гаючых крыніц. Дзейнасць працягвалася і ў іншых знакавых месцах: гэта і крыніца Прасвятой Багародзіцы «Тры ключы» ў вёсцы Красналучка Лепельскага раёна, «Дзедава крыніца» ў Добрушы, крыніца на Замкавай гары ў Навагрудку, крыніца Святога Вялікамучаніка і лекара Панцеляймона ў вёсцы Лоск Валожынскага раёна і іншыя, — адзначыў **першы сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК.**

Урачыстае закрыццё сезона работы валанцёраў прайшло ў Храме-помніку ў гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, што выратаванню Айчыны нашай паслужылі. Хлопцы і дзяўчаты перадалі ў дар збаны са святой крынічнай вадой, каб паказаць павагу да роднай зямлі. **Настаяцель Усіхсвяцкага прыхода протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ** звярнуўся да моладзі з важнымі словамі:

— Трэба, каб кожны наш дзень быў напоўнены добрымі справамі. Калі мы будзем берагчы тое, што з'яўляецца працягам жыцця, многае пераўтворыцца ў нашых душах. Асабліва аб гэтым трэба памятаць у моманты ўнутранага спусташэння. Калі пачынаеце адчуваць холад унутры — ідзіце ў храм, памаліцеся за сябе, за бабуль-дзядуляў. Шукайце Бога, каб запоўніць сваё сэрца. І не ігнаруйце сваю душу.

«Сёлета акцэнт быў зроблены менавіта на крыніцы, таму што яны спрадвеку лічыліся чароўнымі, маючымі асаблівую сілу, — расказала **сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, каардынатар валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» Аляксандра ГАНЧАРОВА.** — Тую самую ваду з розных рэгіёнаў краіны і прывезлі хлопцы і дзяўчаты ў падарунак храму».

Асабісты ўдзел кожнага ў праекце адлюстроўвае трапяткое стаўленне моладзі да гісторыі. **Навучэнец Мсціслаўскага дзяржаўнага будаўнічага каледжа Дзмітрый ВАЛОДЧАНКА** разам са сваёй камандай навёў парадак на тэрыторыі Свята-Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра ў Мсціслаўскім раёне. «Там мы добраўпарадкавалі крыніцу: зрабілі лавачкі, каб каля крыніцы можна было адпачыць, збудавалі навес. Пасля працы адчуваў стомленасць, але быў задаволены тым, што прынёс карысць роднай зямлі. Праекты, прысвечаныя роднаму краю, любові да зямлі, не пакідаюць абыякавым і заражаюць на добрыя справы».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**